**ТУ́БА** (італьян. і лац. tuba труба), шырокамензурны духавы муштуковы аркестравы муз. інструмент самага нізкага рэгістра. З'явілася ў Еўропе ў 1820—40-я г. Уяўляе сабой доўгую састаўную шматразова сагнутую метал. трубку з раструбам і вентыльным механізмам. Валодае мяккім, выразным, аб'ёмным тэмбрам, кантрастнай дынамікай. Асн. яе разнавіднасці: басовая, клавікор, вял. басовая («кайзербас»), паходная, валторнавая («вагнераўская»), гелікон, сузафон. У сімф. і духавых аркестрах выконвае пераважна функцыю басовага голасу, а таксама кантрапункт, сольныя фрагменты і творы. Найб. пашыраны Т.-бас і Т.-кантрабас. На Беларусі вядома з 2-й пал. 19 ст. ў духавых аркестрах: Мінскім гарадскім, Мінскага вольна-пажарнага т-ва, Мінскага рэальнага вучылішча, ваен. аркестрах і інш. Выкарыстана ў творах бел. кампазітараў А.Багатырова, С.Бельцюкова, Э.Казачкова, У.Каральчука.

*Літ.*: Левин С. Духовые инструменты в истории музыкальной культуры. Ч. 1—2. Л., 1973—83. *А.Л.Карацееў.*



Туба.

**ТУБЕРКУЛЁЗ**, інфекцыйная хвароба жывёлы і чалавека, якая выклікаецца мікабактэрыямі — палачкай Коха; адна з *сацыяльных хвароб*. Узбуджальнік адкрыты Р.*Кохам* (1882).

Для чалавека найб. небяспечныя 3 узбуджальнікі: чалавечы, бычыны, афрыканскі. Т. пашкоджвае органы дыхання (найб. часта — 90%), лімфатычныя вузлы, мочапалавую сістэму, косці і суставы, скуру, вочы, кішэчнік і інш. Крыніца інфекцыі — хворы на Т., які выдзяляе з макротай узбуджальнікаў у навакольнае асяроддзе. Заражэнне адбываецца пры кантакце з хворым, праз яго рэчы; пры ўжыванні мяса, малака кароў, хворых на Т. Туберкулёзнае запаленне складаецца са спецыфічных клетак з казеёзным некрозам і поласцямі распаду. Адрозніваюць першасны і другасны Т. Першасны бывае ў неінфіцыраваных людзей, часцей у дзяцей і падлеткаў (туберкулёзны працэс пашкоджвае лёгкія, лімфатычныя вузлы, плеўру). Другасныя формы развіваюцца ў інфіцыраваных людзей пры паўторным заражэнні або рэзкім аслабленні арганізма (бывае ачаговы, інфільтратыўны, фіброзна-кавернозны і інш.). Вылучаюць таксама адкрытыя і закрытыя формы, абвастрэнне і затуханне працэсу. Прыкметы: слабасць, патлівасць, схудненне, павышэнне т-ры цела, кашаль з макротай, задышка. Некат. формы працякаюць непрыкметна або бессімптомна. Выяўленне Т.: у дзяцей — туберкулінавыя пробы, у дарослых — рэнтгенафлюараграфічныя агляды, мікраскапія мазка макроты. Лячэнне: антыбактэрыяльная тэрапія, калапсатэрапія, хірургічнае. Вывучае Т. *фтызіятрыя*. На Т. хварэюць таксама млекакормячыя жывёлы, птушкі.

*Літ.*: Ломако М.Н., Судник С.И., Соболь С.А. Руководство по фтизиатрии. 2 изд. Мн., 1991; Кривонос П.С. Современные возможности и перспективы химиотерапии туберкулеза // Рецепт. 1999. № 1/2; Кривонос П.С. и др. Проблемы туберкулеза в Республике Беларусь на современном этапе // Актуальные вопросы современной медицины: Материалы юбилейной науч. конф., посвящ. 80-летию БГМУ. Мн.,2001. Ч. 1. *П.С.Крыванос.*

**ТУБЯРО́ЗА** (Polianthes tuberosa), кветкавая расліна сям. амарылісавых. Радзіма — Цэнтр. Амерыка. Культывуецца з 16 ст. як эфіраалейная і дэкар. расліна пераважна ў Міжземнамор'і, Паўд.-Усх. Азіі.

Шматгадовая травяністая цыбульная расліна. Кветаноснае сцябло выш. да 120 см. Прыкаранёвае падоўжанае лісце ў разетцы, сцябловае ўкарочанае, вузкалінейнае. Кветкі пахучыя, белыя, дыяметрам 5—8 см, у рыхлым коласападобным суквецці. Эфірны алей кветак выкарыстоўваюць у парфумерыі.

**ТУВА́**, другая назва *Тывы* (Рэспубліка Тыва) у Расійскай Федэрацыі.

**ТУВА́ЛУ** (Tuvalu), дзяржава на ПдЗ Ціхага ак., у Палінезіі. Займае а-вы Тувалу (да 1975 наз. Эліс), за 1050 км на Пн ад а-воў Фіджы. Пл. 26 км². Нас. 10,8 тыс. чал. (2000). Сталіца — г. *Фунафуці* на аднайм. атоле. Афіц. мова — англійская. Адм. падзел — 8 астраўных саветаў. Нац. свята — Дзень незалежнасці (1 кастр.).

**Дзяржаўны лад**. Т. — дзяржава ў складзе *Садружнасці*. Паводле канстытуцыі 1978 кіраўнік дзяржавы — манарх Вялікабрытаніі, які прадстаўлены ў краіне ген.-губернатарам. Заканад. ўлада належыць аднапалатнаму парламенту (12 дэпутатаў), які выбіраецца насельніцтвам на 4 гады. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад на чале з прэм'ер-міністрам.

**Прырода**. Астравы — 9 каралавых атолаў выш. да 5 м, якія працягнуліся з ПнЗ на ПдУ ланцугом даўж. 586 км. Клімат гарачы, субэкватарыяльны. Т-ра пастаянна каля 27 °С з нязначнымі ваганнямі. Ападкаў за год ад 2500 мм на Пн да 3300 мм на Пд. Бываюць засухі. Рэк і ручаёў няма. Адзначаюцца разбуральныя тайфуны. Расліннасць аднастайная. На ўзбярэжжы солетрывалыя кусты і дрэвы (сцэвола, панданус і інш.), ва ўнутр. частках астравоў — гаі какосавых пальмаў, дрэвы гуэтарда, пізонія, калафіліюм, папараці. Жывёльны свет бедны. Шмат марскіх птушак. Мора багатае рыбай, малюскамі, ракападобнымі. Астравам пагражае затапленне, якое выклікана пацяпленнем клімату і пад'ёмам узроўню акіяна.

**Насельніцтва**. Больш за 90% — тувалу, народ палінезійскага паходжання. Ёсць тувалу — еўрапейскія метысы, мікранезійцы і інш. Амаль усе вернікі — пратэстанты-кангрэгацыяністы. Сярэднегадавы прырост насельніцтва каля 1,4%. Сярэдняя шчыльн. 417 чал. на 1 км². Больш за палавіну засяроджана на атоле Фунафуці, дзе знаходзіцца г. Фунафуці (каля 4 тыс. ж.). 75% насельніцтва занята ў сельскай гаспадарцы і рыбалоўстве, каля 25% — у сферы абслугоўвання. Каля 1 тыс. чал. працуюць за мяжой (матросамі на замежных караблях).

**Гісторыя**. А-вы Т. заселены палінезійцамі з а-воў Самоа і Тонга ў 1-м тыс. н. э. Першы з еўрапейцаў, хто наведаў а-вы Т., быў ісп. мараплавец А.Менданья. У 1892. пад назвай а-вы Эліс, аст-вы Т. сталі ч. брыт. пратэктарата А-вы Гілберта і Эліс, з 1916 калонія Вялікабрытаніі. У 1974 рэферэндум жыхароў а-воў Эліс ухваліў іх адасабленне ад а-воў Гілберта. З 1.10.1975 асобная калонія Вялікабрытаніі пад мясц. назвай Т. 1.10.1978 абвешчана незалежнасць Т. ў складзе Садружнасці. У Т. адсутнічаюць паліт. партыі. Т. — чл. ААН (з 2000).






Герб і сцяг **Тувалу**.




РЭПАЗІТОРЫЙ БДМУ